Цана асобнага нумару 20 грош.

# БЕЛАРУСКАЯ СПРАВА

Выходзіць два разы ў тыдзень.

| | | |
|---|---|---|
| **Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:** **Вільня, Віленская вул. 12—6. (Wileńska 12, m. 6).** Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3. | Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 2 зл. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэса 30 гр. Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі. | **Цана абвестак:** перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок пэтыту ў 1 шпальту. |

№. 8 — Вільня, Субота, 15-га трауня 1926 г. — Год I.

**№ 7 „Беларускае Справы“ з 14-га траўня с. г. сканфіскаваны ўладай за перадавіцу „Дыктатура буржуазіі“ і стацьцю „Ці ўсё ў парадку?“. У № 8 сканфіскаваны артыкулы „Тры праграмы“ і „З падарожы па Радавай Беларусі“. Нумар гэты выходзе другім выданьнем.**

## „Спроба сілы“.

Як раз у той мамэнт, калі фашыстаўскі кірунак так горда падыймаў ужо сваю галаву, спадзяючыся, што пры новаўтвораным урадзе Вітаса яму ўдасцца аканчальна ўмацаваць свае сілы і ўплывы на дзяржаўнае жыцьцё Польшчы, — у Варшаве адбыліся падзеі, якія *могуць* рэзка павярнуць ход далейшага разьвіцьця палітычных і сацыяльных адносінаў у межах Польскае дзяржавы.

Ніжэй мы падаем агляд варшаўскіх выпадкаў паводле вестак, прайшоўшых ужо ў другіх газэтах праз мяйсцовую цэнзуру. Тут-жа, не затрымліваючыся на агульнай ацэнцы кроку мар. Пілсудскага, мы хочам адзначыць тыя магчымасьці, якія перад намі паўстаюць у выпадку давядзеньня п. Пілсудскім да канца распачатае ім акцыі.

З слоў прамовы марш. Пілсудскага, сказанае ім пасьля заняцьця Варшавы, трэба перадусім адзначыць адно: гэта—імкненьне яго падыйсьці да разьвязаньня ў Польшчы сацыяльнага пытаньня—ў кірунку здаваленьня інтарэсаў працоўных.—„*Ня можа быць у дзяржаве зашмат несправядлівасьці ў адносінах да тых, што іншым працу сваю аддаюць*!“—сказаў п. Пілсудскі. Інакш—дзяржаве пагражае пагібель. І вось, каб ратаваць Польшчу ад пагібелі, марш. Пілсудскі, як сам кажа, наважыўся на „*спробу сілы* з усімі яе консэквэнцыямі“....

Пагляд гэты—зусім справядлівы: ня можа разьвівацца і крапчэць дзяржава, у якой залішне многа пакрыўджаных, залішне многа нездаволеных існуючым ладам. Раз працоўныя масы—прадстаўнікі фізычнае сілы краю—незацікаўлены ў існаваньні ўстаноўленага ладу ў дзяржаве, дык хто-ж іншы і якім спосабам можа ратаваць гэту дзяржаву ад магчымых пагроз яе існаваньню?!...

Але.... але ад пекных і разумных слоў да зьдзейсьненьня іх на дзеле—яшчэ заўсёды дужа далёка. Прынамся навучыў нас, беларусаў, так глядзець на справу абяцанак і пасулаў—сам пан Пілсудскі!..

Чаго-ж бо нам толькі ня суліў першы галава польскае дзяржавы ў той мамэнт, калі тая дзяржава толькі йшчэ тварылася, і калі ён сам, як дыктатар, меў блізу неабмяжованую ўладу „на Усходніх Землях“? — Усе мы гэта добра памятаем... А што з гэных абяцанак зьдзейсьнілася?—Ды роўным лікам—нічога! Пан Пілсудскі, як Начальнік Дзяржавы, ня здолеў зламаць ані польскага нацыяналізму, ані польскага абшарніцтва, якое неабмяжована распаношылася па ўсей Заходняй Беларусі ды паношыцца і сяньня. Замест зямлі нашае сялянства атрымала.... вайсковых асаднікаў. Замест роднае школы — чужацкую. Замест дапамогі ў адбудове пасьля ваеннае руіны—вялізарныя падатковыя цяжары, якія нашы сяляне мусяць плаціць затым, што абшарнікі карыстаюцца ўсялякімі палёгкамі і рашуча ўхіляюцца ад учасьця ў гэных цяжарах... Замест самаўрадаў, якія-бы далі-б нашаму сялянству магчымасьць запраўды самому гаспадарыць на сваёй зямлі, — маем „самаўрады паноў старостаў“, паназначаных якраз урадам п. Пілсудскага бадай выключна спаміж абшарнікаў.

Так выглядалі словы і—дзела.

Ці хваце цяпер пану Пілсудскаму сілы волі і ахвоты запраўды вызваліць рознаплямённыя працоўныя масы—сялянства і работнікаў — з таго нязвычайнага цяжкага палажэньня, у вытварэньні якога сам-жа ён у значнай меры вінаваты? Ці здолее ён шчыра абаперціся на працоўных і *праз іх* зьдзейсьніць ідэалы? — Вось пытаньні, адказ на якія цяпер пан Пілсудскі мусіць даць ужо *не славамі, а — учынкамі*. Перачыркнуўшы адным махам усю тую палітычную і сацыяльную лінію, па якой Польшча йшла ў працягу сямёх гадоў, пан Пілсудскі павінен будзе распачаць перабудову дзяржавы ад фундамэнтаў, апіраючыся на работнікаў і сялян. Інакш — увесь ягоны сяньняшні высілак будзе змарнаваны.

## Дыктатура Маршалка Пілсудскага.

15 мая ў Вільні расклеена афіцыяльнае абвяшчэньне ген. Рыдза-Сьміглага, што **Маршалак Пілсудскі аб'явіў сябе дыктатарам.**

Генаральны штаб паведамляе: **Прэзыдэнт Войцеховскі зрокся ўлады на карысьць маршалка Пілсудскага.** Урад Вітоса распушчаны.

### З чаго пачалося.

Урад Вітаса, які сфармаваўся — без паразуменьня з Марш. Пілсудскім—дый назначыў новага ваеннага міністра—антыпілсудчыка;—добра ведаў, што гэтым правакуе Марш. Пілсудскага на поўную акцыю пратэсту.

Дзеля таго, каб паралізаваць пасьледзтвы гэтай акцыі, дый, трэба думаць, манючыся ў патрэбны мамэнт папросту — арыштаваць неспакойнага Маршалка, урад Вітаса зараз-жа—ўжо 12 траўня—нагнаў у Сулеювэк, дзе жыве Марш. Пілсудскі, цэлую масу шпікоў....

Гэтыя шпікі выклікалі неспакой сярод стаяўшых тут і ў ваколіцах, адданых Марш. Пілсудскаму войск, з якіх зараз-жа сфармавалася ваенная ахова дому Марш. Пілсудскага.

Акурат у 12 гадзіне ўначы завялася перастрэлка між гэтым шпікамі і абаронцамі дому Пілсудскага.

Гэта страляніна і выклікала зараз-жа трывогу сярод адданых Пілсудскаму войск.

Калі Марш. Пілсудскі раніцай 13 выехаў да Варшавы, каб пратэставаць проці „непакоеньня яго дому“, верныя яму войскі затрымалі яго, перасьцерагаючы ад небясьпекі.

Зараз-жа высьвятлілася, што камандзір гарнізону ў Рэмбэртове меў загад ад ураду — акружыць артылерыяй увесь Сулеювэк, але — загаду ня споўніў...

Апроч гарнізону Рэмбэртова пачалі надходзіць верныя Пілсудскаму палкі адзін па адным—з Седлец, Любліна, і інш бліжэйшых да Варшавы мест. Пілсудскі перайшоў у наступленьне.

Галоўную роль у-ва ўсей акцыі адыграў 7 полк уланаў і 1 полк шволежэраў.

Каля 3 гадзіны яны ўжо занялі абодва галоўныя масты, якія злучаюць Варшаву з Прагай (прадмесьце Варшавы).

Каля 6 гадз. пад самай Варшавай стаяла ўжо вялікая армія верных Пілсудскаму войск, сярод якіх быў і сам Марш. Пілсудскі. Пачалася перастрэлка між імі і ўрадавымі войскамі.

Паліцыя на Празе зьнікла, як быццам яе ня было, тыя атрады, каторыя працівіліся—былі разаружаны войскамі Пілсудскага.

### Спатканьне Марш. Пілсудскага з празыдэнтам Войцеховскім.

У 5 гадз. пад мост Панятоўскага пад'ехаў Прэзыдэнт Войцеховскі, які заявіў, што хоча паразумецца з Пілсудскім. Пілсудскі згадзіўся, але першым чынам патрэбаваў, каб Прэзыдэнт даў адстаўку ўраду Вітаса; а толькі пасьля гэтага можна будзе паразумецца... Відаць, Прэзыдэнт адмовіўся—і паразуменьня не адбылося, бо — як толькі ён ад'ехаў, дык зараз-жа ўрадавыя войскі рассыпаліся ланцугом дый пачалі—бой.

### Зварот да Прэзыдэнта.

Перад паездкай Прэзыдэнта да Пілсудскага—у Бэльвэдэр зьявіліся прадстаўнікі польскай лявіцы — ППС, Вызваленьня і Клюбу Працы, — каб знайсьці выхад з палажэньня — без праліцьця крыві.

Але Прэзыдэнт праз ад'ютанта заявіў, што мае важнейшыя справы, дык — каб дэлегацыя зьвярнулася да—ураду Вітаса... Тады дэлегацыя польскай лявіцы заявіла для перадачы Прэзыдэнту, што ўсю адказнасьць за ўсе пасьледствы яна ўскладае на яго...

### Вітас абвяшчае—асаднае палажэньне.

Каля 9 гадз. ўвечары Вітас абвясьціў **асаднае палажэньне**, назначыўшы генарал-губэрнатарам Варшавы ген. Развадоўскага. Уся паліцыя злучана з урадовым войскам і пераведзена на ваеннае палажэньне. Адначасна—прыпынены ўсе так званыя „канстытуцыйныя гарантыі“ — ці свабоды і правы грамадзян. Асаднае палажэньне ўведзена ў ваяв. Варшаўскім, Віленскім, Люблінскім і ў некаторых паветах іншых ваяводзтваў.

### Камэндантура занята Пілсудскім.

Аб ходзе бою пакуль што вестак няма. Ведама толькі, што а 9 гадзіне вечара адданымі Пілсудскаму войскамі занята — ў тылу ўрадавых войск—(?)—Камэндатура м. Варшавы

### Урад Вітаса ўцёк да Бэльвэдэру.

Зараз-жа па атрыманьні гэтай весткі ўрад Вітаса, які сядзеў у гмаху Прэзыдыуму Рады Міністрау, уцёк цішком у закрытых аўтамабілях — пад моцнай аховай паліцыі — да Бэльвэдэру, дзе сядзеў пад аховай верных яму войск Прэзыдэнт Войцеховскі.

### Варшава ў руках Пілсудскага.

У палове 11 амаль ня ўся Варшава ўжо была ў руках войск Пілсудскага, ня гледзячы на тое, што ўрадавыя войскі асталіся на занятых пазыцыях. Страляніна яшчэ йдзе, але перамога ўжо бязумоўная і поўная.

У 1 уначы Марш. Пілсудскі зрабіў заяву прадстаўнікам прэсы—якая падана ў перадавіцы.

## Новы тымчасовы урад.

Скінуўшы ўрад Вітаса, марш. Пілсудскі назначыў Тымчасовы ўрад — у складзе: Ярашэвіч—Камісар Ураду, пасол Бартэль (Клюб Працы), як міністар чыгункі, і—Кноль, як міністар замежных спраў.

## Вітос з міністрамі уцяклі.

Войска Марш. Пілсудскага здабыла Бэльвэдэр, але ані ўраду Вітаса, ані Прэзыдэнта Войцеховскага там не аказалася: **Вітос з сваімі сябрамі ўцёк на аэраплянах, а п. Войцеховскі—на аўтамабілі.**

## У ВІЛЬНІ.

На вуліцах расклеены офіцыяльныя абвяшчэньні аб тым, што забараняюцца ўсялякія сходы, мітынгі і маніфэстацыі. Такжа **забаронена выхадзіць на вуліцы ўначы**—ад 11 да 5 гадз. раніцы.

Спробы зрабіць маніфэстацыі на карысьць Марш. Пілсудскага 14.V былі разагнаны паліцыяй.

# Унутраная вайна у Англіі.

У Англіі адбываецца вялікая ўнутраная вайна. Уласьнікі вугальных капальняў пастанавілі на першага мая работнікам новыя варункі працы: прадоўжаньне рабочага дня пры адначасным зьмяншэньні зарабсткаў. З прычыны таго, што спробы паразуменьня да нічога не давялі, вуглякопы, як ужо ведама, распачалі забастоўку. Англійскія работнікі транспарту і іншых галін прамысловасьці, бачучы няуступлівасьць фабрыкантаў і добра разумеючы, што абніжаньне заработкаў у адным фаху — пацягне за сабой тое самае і ў іншых, прылучыліся да забастоўкі вуглякопаў.

Разам кінулі працу 6 мільёнаў работнікаў.

Падзеі ў Англіі маюць вялікае значэньне і для ўсяго сьвету: перамога фабрыкантаў тут была-б паражэньнем работнікаў ня толькі англійскіх, але і ўва ўсіх іншых дзяржавах. Усюды па прыкладу Англіі — фабрыканты пачалі б зьніжаць заработную плату і прадоўжываць рабочы дзень. Наадварот, усьпешная забастоўка ня толькі стрымаець наступ капіталістаў і практычна навучыць працоўныя масы таму, што арганізованым выступам можна дабіцца сваіх правоў.

Гэта будзе валам у капіталістычнай крэпасьці, бо англійскія забастоўшчыкі паставілі сабе за задачу дабіцца так-жа і права паставіць свой кантроль над вугальнай прамысловасьцю, хочуць адабраць у буржуазіі права ўсяўладна распараджацца багацьцем краю і жыцьцём мільёнаў людзей.

Змагаючыся, англійскія работнікі выступаюць, як адзін з атрадаў рэвалюцыйнай арміі працоўнага люду ўсяго сьвету. Дабіваючыся ў Англіі кантролі, яны падрываюць асновы пануючага цяпер на ўсім сьвеце парадку. Капіталістычны парадак і заключаецца якраз у тым, што фабрыканты і паны, захапіўшы ў свае рукі ўладу безнаказанна і безкантроляна грабяць народ.

Дык і ўвесь сьвет, сочучы за забастоўкай, падзяліўся на два варожыя сабе табары: капіталісты з аднаго, працуючыя масы з другога боку.

Мо' яшчэ ніколі ня выявілася ў такой поўнай меры міжнародавая салідарнасьць працуючых мас, як у гэтым выпадку.

Інтэрнацыянал вуглякопаў у Брусэлі выдаў загад усім сваім арганізацыям па розных дзяржавах ня грузіць вугля ў Англію. Гэткім чынам англійскіх капіталістаў змушаюць лічыцца з дамаганьнямі вуглякопаў: з заграніцы вугальля яны не дастануць!..

На ўсім сьвеце працуючыя масы зьбіраюць грошы на галадаючых англійскіх забастоўшчыкаў. У Вільні, паміж іншым, зьбіраюць сярод сваіх сяброў складкі і прыймаюць іх ад другіх, работнікі, арганізованыя ў клясавых прафэсіянальных саюзах.

Савецкія вуглякопы выслалі ўжо ў Лёндан 250 тысяч рублёў для бастуючых. Усюды ў СССР адбываюцца сходзіны, дзе абгаварываецца справа помачы. Вываз усіх тавараў з СССР у Англію—спынены.

Камуністычны інтэрнацыянал распачаў шырокую акцыю дзеля паддзержываньня забастоўшчыкаў; ідуць перагаворы з II Інтэрнацыяналам, маючы мэтай аб'яднаньне сіл дзеля супольнай помачы. Калі б да гэтага дайшло, — ня выключана забастоўка работнікаў у ўсіх краёх Поўначы.

З другога боку, англійскія капіталісты ўсімі спосабамі стараюцца зламаць забастоўку.

Ідзе шырокая арганізацыя штрэйкбрэйхераў, каб заступіць бастуючых работнікаў і пусьціць у ход машыны. У першы чарод зьвернена ўвага на наладжаньне транспарту пры помачы штрэйкбрэхераў, бо-ж гэта найбольш балючае мейсца.

На старане фабрыкантаў адкрыта і бяз усякіх засьцярогаў стаіць англійская ўлада. Дзеля таго, каб задаволіць ненасытных капіталістаў і абабраць да рэшты работнікаў, яна не задумываючыся ўвяла ўвесь край ў цяжкі крызіс.

У Англіі абвешчаны „надзвычайны стан“. Англія падзелена на ваенныя акругі з дыктатарамі на чале, якія напр. маюць права арыштовываць людзей амаль бяз усякіх фармальнасьцяў. Паліцыя пастаўлена да абароны штрэйкбрэхераў. Пры прадоўжаньні крызісу—мае быць ужыта для зламаньня забастоўкі войска і ваенны флёт.

У апошнія дні забастоўшчыкі актыўна пачалі бароцца, як з дабравольнымі слугамі капіталістаў, так і з ахранай. Ёсьць ужо і ахвяры. Вайна з бяскроўнай пачынае перахадзіць у крывавую. Адначасна забастоўка пашыраецца: што раз то ў новых галінах прамысловасьці работнікі кідаюць працу.

---

12/V Польскае тэлеграфнае агенства ў Лёндане данясло аб заканчэньню агульнай забастоўкі ў Англіі. На якіх варунках згодзіліся работнікі вярнуцца да працы — ведамасьцей пакуль што няма. Напішым аб гэтым у наступным нумары, калі камунікацыя ў Польшчы, перэрваная цяпер вялікімі ўнутраннымі патрасеньнямі—будзе наладжана.

# Першага мая на правінцыі.

## У Лідзе.

У Лідзе першамайскую маніфэстацыю арганізавалі пэпэсы. Шмат прыйшло сялян з вёсак; людзей было з поўтысячы.

Пэпэсы ўсьцешыліся, але не надоўга. Разышоўся слух, што будзе ў Лідзе пасол Балін з „Незалежнай Партыі Хлопскай“, аў яго пэпэсы надта ня любяць і баяцца.

Як толькі скончылі гаварыць іхныя два прамоўцы, хтосьці крыкнуў, каб далі слова паслу Баліну,—а таго навет у памешканьне ня пусьцілі! Падняўся шум, бура воплескаў, дамаганьне, каб дапусьцілі Баліна, а на пэпэсаў крычалі: угадоўцы! далоў! і г. д. Пэпэсы, бачучы, што блага, абвесьцілі сход зачыненым і пайшлі, як кажуць, „ня солана хлябаўшы“. Веча іх было разьбіта.

На вечы пэпэсы гаварылі папольску, мала хто іх разумеў.

Лаялі яны бальшавікаў і хвалілі сябе.

Але ясна, ніхто ім ня верыць; не паможа ім і іх „Красное знамя“, бо беларускія сяляне і работнікі ўжо ведаюць, чаго яны варты. Тутэйшыя сяляне і работнікі лічаць беларускую сялянска-работніцкую Грамаду сваей арганізацыяй, бо-ж яна запраўды бароніць інтарэсы працуючых мас.

**Лідчанін.**

## У Кобрыне.

Невялікае места, налічываючае якіх-небудзь 8 тысяч жыхароў, невялікі лік работнікаў. Першы май, аднак, прайшоў тутка вельмі бурна. За некалькі дзён перад сьвятам паліцыя арыштавала каля 30 чалавек. Езьдзіла яна па вёсках, рабіла вобыскі, загадывала сялянам ня ехаць 1-го ў места.

30/IV вечарам узброенае войска акружыла горад, пастаўлена было ад 10 да 12 кулямётаў.

1/V амаль ня ўвесь 83 п. п., што стаіць у Кобрыне, і мясцовая паліцыя выйшлі на вуліцу ды, праходзячы дэфілядамі па месту, сьвяткавалі сваю вернасьць пануючым клясам.

Працоўным-жа, ня гледзячы на іх жаданьне, нельга было зьбірацца навет у больш-менш вялікія кучкі. Можна затое было глядзець на каскі, штыкі, вінтоўкі, і г. д. Агулам, гледзячы з боку, можна было падумаць, што гэта ня сьвята працоўных, а сьвята войска і паліцыі!

У іхнай маніфэстацыі прыймалі ўчасьце хлапцы 8—10 летнія і старцы, каторыя парупіліся зарабіць у гэты дзень па пару злотых за здраду працоўных.

У нас нічога ня было, хоць ведаем, што ў Берасьці адбываліся паходы з штандарамі і песьнямі працоўных, налічываючы кала 3 тысяч людзей. Трэба адзначыць, што ўкраінская каапэратыва, асснованая на абломках гэтакай-жа бібліотэкі (гандаль дае больш у кішэню, як асьвета), у дзень 1-го мая была адчынена. Разам з іншымі крамамі яна таргавала і зарабіла мусіць пару грашаў, бо-ж была субота.

**Беларус.**

# Суд над „цэнтраляй“ польскіх фашыстаў.

Пасьля трох з паловай гадоў сьледзтва нарэшце дачакалася суда галосная справа рыхтаваўшагася ў 1923 г.—у часе панаваньня ў Польшчы ўраду Хіена-Пяста—**фашыстаўскага перавароту**, які мела зрабіць так-званае „Пагатове Патрыётаў Польскіх“ (П.П.П.). Тады ўся справа магла раскрыцца толькі дзеля таго, што хіена-пястоўскі ўрад нарэшце зваліўся, дык і „пераварот“ неяк не дасьпеў да зьдзейсьненьня. І цікаўна, што якраз цяпер, калі фашыстаўскія імкненьні ўжо саўсім рэальнаператвараюцца з лятуценьняў у дзела, як „адзіны астаўшыся спосаб ратаваньня краю“, цяпер „цэнтраля польскіх фашыстаў“ садзіцца на лаўку абвінавачаных. Запраўды-ж — ня можна было выбраць больш карыснага для падсудных мамэнту!..

На лаўцы падсудных сядзіць толькі 6 асоб, сёмы—камісар паліцыі — не дачакаўся суда ды памёр. Паміж абвінавачанымі — генарал і палкоўнік польскай арміі, праўда—у адстаўцы. Але ж кожнаму ясна, што гэта—зусім не запраўдны штаб польскага фашызму, а так сабе—адзін з гурткоў, ці мо найбольш рызыканцкая, найменш канспірацыйная і няздарная першая баёўка, раскрыўшая карты, як „пробны шар“, каб аблягчыць працу галоўным сілам штабу.

Бароняць папаўшыхся фашыстаў „найлепшыя сілы“ „чорнай сотні“ польскай адвакатуры.

Апрача генарапаў, палкоўнікаў і паліцэйскіх камісараў, у склад фашыстаўскай арганізацыі, як сьцьвярджае акт абвінаваченьня, уваходзілі — (як каліcьці ў расейскую чорную сотню—папы)—польскія ксяндзы. У аднэй Варшаве аж чатыры касьцёлы з сваімі айцамі капуцынамі ды бэрнадынамі былі мейсцамі сходаў і прысягі сяброў П.П.П.

У арганізацыі было шмат ваенных, апрача цывіляў. Зьбіраліся складкі на аружжа. Зьбіраліся найвялікшыя „зборы“ — на могілках (сымвалічна!). Выдавалі падпольныя адозвы, заклікаючы да ўвядзеньня дыктатуры ў Польшчы. Арганізацыя мела шырока разгалінёную сець аддзелаў — ваяводзкіх, павятовых і г. д. У „галавы“ яе Пэнкаслаўскага знойдзены пры вобыску цэлы вялізарны архіў ды канцэлярыя, з якімі ён, як відаць, навет і ня крыўся.

З дакумэнтаў відаць, што Сойм і Сэнат мелі быць разагнаны, а замест іх мелі быць „арганізаваны здаровыя сілы народу“ (—ведама-ж, толькі і выключна польскага!)—пад дыктатурай свайго „Мусоліні“. У праграме арганізацыі на першым пляне стаяў — **тэрор**.. Неабходнасьць тэтору тлумачылася тым, што ўсе беды ў Польшчы залежаць ад засільля ў ёй — зразумела-ж перадусім жыдоў, ды іншых меншасьцяў, якія захапілі аж 90 мейсцаў у чыста польскім Сойме. Дык ясна-ж, што ўсіх гэтых шкоднікаў польскай дзяржаўнасьці П.П.П. мела перадусім пазбавіць мандатаў... на жыцьцё. Пасьля слаўнай Кракаўскай бойні Галоўная Рады П.П.П. пастанавіла чым хутчэй прыступіць да тварэньня „баявых атрадаў“—у шырокім маштабе, скіраваных проці работніцкай клясы, сацыялістаў ды камуністаў. Знойдзены дакумэнты аб сувязі і з Ваенным Міністэрствам...

Пракурор у акце сьцьвярджае, што П.П.П. выразна стала на шлях падрыхтаваньня замаху, што ясна з цэлага раду загадаў цэнтралі — да сваіх аддзелаў. Замах меў быць выкананы ў канцы лістапада 1923 г. У акцыі мелі прыняць учасьце ўсе верныя П.П.П. афіцэры цэлага раду палкоў Варшаўскага, Віленскага, Кракаўскага, Пазнанскага і інш. гарнізонаў. Першым чынам мелі быць захоплены склады аружжа, арсэналы, крэпасьці, пляны якіх усе былі ў архіве арганізацыі.

---

Усе абвінавачаныя прызнаюцца да сяброўства П.П.П., але віны ніякай у гэтым ня бачаць. Найбольш крымінальныя рэчы перакідываюць адзін на аднаго. Цікаўна і тое, што „галава“ Пэнкаславскі, пасьля арышту ў студзені 1924 г., вельмі ахвотна ды шчыра раскрываў усю арганізацыю, называючы ўсіх яе сяброў. Бо-ж ведама: чаго-ж хаваць найлепшых „патрыётаў польскіх“?!

У сваім часе вельмі многа пісалася аб блізкім учасьці ўва ўсей гэтай арганізацыі самога ваеннага міністра Хіена-Пяста — „слаўнага“ генарала **Шэптыцкага**. Выкліканы цяпер, як сьведка, генарал нешта „амаль нічога не памятае“. Аднак-жа неяк усё-ж такі ўспамінае, што ня раз і ня два разы размаўляў ды прымаў у сябе, будучы міністрам, абодвух галоўных канаводаў фашыстаўскай галоўнай банды, якія шчыра адкрывалі яму меты і характар арганізацыі. Прызнаецца, што пад націскам Пэнкаславскага—пасьля кракаўскіх падзей (бойня работнікаў з войскам і паліцыяй па загаду хіена-пястоўскага ўраду 6-га лістапада) — прыняў рашучыя папераджаючыя меры ў Варшаве. Запярэчывае толькі заяве Пэнкаславскага, што ён, ген. Шэптыцкі, як ваенны міністар, — меўся стаць на чале ўсяго перавароту П.П.П.

Другі сьведка падкамісар паліцыі **Сухэнэк** сьцьвярджае, што абвінавачаныя мелі зносіны і з другім міністэрскім стаўпом Хіена-Пяста—п. Гломбіньскім.

Сьведка ген. **Жукоўскі** прызнаецца, што атрымоўваў адозвы П.П.П., якія яму вельмі падабаліся. Бываў гэты генарал і на розных сабраньнях П.П.П. ў генаралаў ды ксяндзоў, а навет на „прысягах“ у падзямельлях касьцёлаў. Абяцаў ён фашыстам і сваё „супрацоўніцтва“.

Далейшы сьведка інжэнер **Паўлі** ўвайшоў у арганізацыю, пэўны, што ў яе складзе былі старшыня Сэнату Тромпчыньскі (эндэк), Карфанты, Строньскі, ген. Галлер і інш. З другога боку сьведку непакоілі весткі аб спробах паразуменьня Пэнкаслаўскага з... п. Тугуттам ды — Язэпам Пілсудскім! Гэтага сьведка сьцярпець ужо ня мог і — выйшаў з арганізацыі. Дзівіўся сьведка і з таго, што павадыр гэткай замахоўскай арганізацыі канфэруе з сваім міністрам унутраных спраў п.Кернікам, які чамусьці — не арыштоўвае замахоўца. У арганізацыю шырока ўцягвалі вучнёўскую ды студэнцкую моладзь, аб якой Пэнкаславскі характэрна выражаўся, што — „хай лепш яна не атрымае матуры, але — каб мела народова-польскую сьведамасьць“.

Далей выступае цэлы рад сьведкаў—былых „камэндантаў“ розных „акругоў“, на якія разьдзялілі фашысты ўсю Польшчу. Усе яны „багатэлізуюць“ усю справу, ці — жартавліва прадстаўляюць усю акцыю П.П.П., тлумачучы „непаважнасьцю“ яе свой выхад з арганізацыі.

Іншы ізноў сьведка сцьвярджае, што мін. Кернік цікавіўся бандай П.П.П. ды пытаўся ў яго, ці ўжо належыць да яе. Сцьвярджае і тое, што атрымаў грошы для П.П.П. ад брата ваеннага міністра ген. Шэптыцкага.

Яшчэ адзін з чысленых фашыстаўскіх генаралаў—ген. **Мацэвіч** — прызнаўся, што належаў да арганізацыі, але дзеля таго, што яна была — процікамуністычнай! Сцьвярджае, што П.П.П. вяло перагаворы з пэсламі Сойму (ведама-ж—правіцай), каб мець падтрыманьне „Сойму“—пры замаху.

Адзін з абвінавачаных заяўляе, што праграму П.П.П. даў цэламу раду высокапастаўленых асоб у Польшчы.

Рад сьведкаў сцьвярджае, што фашысты згадзіліся, каб дыктатарам стаў навет.... Пілсудскі, абы толькі—здушыць камуністаў, жыдоў з меншасьцямі ды сацыялістаў.

---

Працэс гэты працягнецца, відаць, не адзін тыдзень. Але ўжо і цяпер ясна, што арганізацыі спачувалі больш-менш актыўна ўсе дзеячы польскай правіцы,—на чале з генаралітэтам ды міністрамі Хіена-Пяста. Ясна і тое, што—П.П.П. — толькі зародак польскага фашызму, які ў 1923 г. толькі пачаў разьвівацца хутчэй. Судзяць цяпер якраз гэтых **непаважных** „прымачкоў“ польскага фашызму, які, пусьціўшы пасьля арышту іх глыбейшыя ды шырэйшыя карані ў Польшы, працуе зусім паважна — праз эндэцка-пястоўскія ўрады — дзеля тых самых мэтаў, якія ставілі сабе і „непаважныя“—п. п. Пэнкаславскія.

# Важнейшыя здарэньні.

## У Польшчы.

### Склад габінэту Вітаса.

Пасьля 2-х няўдалых спробаў аднаўленьня ўраду Хіена-Пяста—пад старшынствам п. Вітаса—усё-ж такі ў канцы канцоў уся гэтая кумпанія пагадзілась адносна „партфэляў“ дый сьпелася аканчальна.

10-га траўня п. Прэзыдэнт зацьвердзіў прадстаўлены п. Вітасам габінэт—у гэткім пакуль-што складзе: прэм'ер—п. Вітас, часовы мін. замежных спраў—кіраўнік Дзяржыкрай (!) — Маравскі (хадэк), мін. унутр. — сэн. Смульскі (душа ўсіх законаў для „Крэсаў“, выдуманых цагэтуль!), ваенны міністар — ген. Мальчэвскі, мін. скарбу—той-жа (?) п. Зьдзеховскі (эндэк), мініст. асьветы—той-жа—п. Ст. Грабскі (эндэк), мін земляробства той-жа—п. Кернік (Пяст), мін. гандлю і прамысловасьці—той жа п. Алецкі (Пяст), мін. чыгункі—

Хандзыньскі (нацыяналіст-работнік), мін. зямельных рэформ—Радван (Пяст.).

У абодвых міністэрствах работніцкіх—вакансіі,—бо іх хочуць папросту скасаваць.

### Канфіскацыя „Kurjera Poran.“.

У „Słowie“ зьмешчана тэлеграма з Варшавы з 11-га траўня гэткага зьместу:

„Сягоньня па загаду ўраду сканфіскаваны „Kurjer Poranny“ за інтэрвью, у якім маршалак Пілсудскі робіць закід партыі „Пяст“ і галаве гэтае партыі — цяперашняму прэм'еру Вітасу, што спрыяюць зладзеям“.

## Заграніцай.

### Вялікія манёўры ў Б.С.Р.Р.

У пачатку ліпня ў ваколіцах Смаленска маюць адбыцца вялікія манёўры чырвонай арміі, у якіх возьмуць учасьце войскі Віцебскага, Менскага, Смаленскага і Маскоўскага ваенных акругоў.

### Варашылаў аб Бэрлінскім Трактаце.

У першамайскай адозьве да чырвонай арміі Варашылаў заяўляе, паміж іншым, аб Бэрлінскім Трактаце,—што—„гэты Трактат, як і Трактат расейска-турэцкі, збудаваў новыя непераможныя барыкады на шляху сусьветнага імпэрыялізму, які прэцца ізноў, як шалёны, у пропасьць новых крывавых бойняў, нябачаных яшчэ ў гісторыі“...

### Нямецка-турэцкі саюз.

Бэрлінскія газэты пішуць, што ў хуткім часе будзе падпісаны саюзны трактат з Турцыяй — такі самы, як Бэрлінскі Трактат з ССРР. Як ведама, ваенна-гаспадарчы дагавор між Турцыяй і ССРР ужо падпісаны паўгоду назад. Гэткім чынам на ўсходзе Эўропы створыцца — з падпісаньнем турэцка-нямецкага саюзнага дагавору такое магутнае аб'яднаньне дзяржаў, якое здолее паралізаваць усялякую небясьпеку для ўсіх трох сяброў саюзу з боку ўсіх іх ворагаў.

### Новы „манархічны скандал“ у Нямеччыне.

Нямецкі ўрад, без паразуменьня з Рэйхстагам (парлямантам), падсунуў для падпісу прэзыдэнту Гіндэнбургу загад аб зьмене новых „рэспубліканскіх калёраў“ дзяржаўнага сьцягу Нямеччыны—старымі імпэратарскімі. Ува ўсей рэспубліканскай Нямеччыне, а перадусім—у сацыял-дэмакратыі—узьнялося страшэннае абурэньне. Адбыліся чысьленыя мітынгі пратэсту. Але Гіндэнбург разам з урадам упорна кажа, што цяпер зьмяняць загад, падпісаны галавой дзяржавы і разасланы ўсім прадстаўнікам Нямеччыны заграніцай, — гэта значыла-б кампрамітаваць павагу дзяржавы. Што казаць—чыста зроблена! З калёраў пачаўшы, ідуць упорна да „адбудовы“—Гогэнцоллернаў.

### Водгукі англійскай забастоўкі на кантынэньце.

У выніку забастоўкі англійскі фунт значна ўпаў. Каб ратаваць сваю валюту, Англійскі Банк выкінуў на рынак вялізарныя запасы чужых валютаў, у выніку чаго курс гэтых валютаў значна ўпаў на Лёнданскай Біржы, якая задае тон—дыктуе курс—усім іншым у Эўропе. Найбольш з усіх пацярпеў францускі франк.

Але англійская забастоўка ня толькі падбіла чыста біржавым ударам францускі франк: яна падбіла франк яшчэ і больш страшным гаспадарчым ударам. Англія што-год купляе ў Францыі на 10 мільярдаў франкаў розных тавараў, ды на 2 мільярды купляе француз у англійца. Дык вось забастоўка можа падарваць увесь гэты вельмі важны для ўтрыманьня францускай валюты—даход.

Значна больш важным — ужо агульна-палітычным—вынікам англійскай забастоўкі, калі яна зацягнецца надаўжэй, будзе поўны або частковы параліж актыўнасьці сусьветнай палітыкі англійскага імпэрыялізму — аграбліваньня каляніяльных народаў...—Бо—укушаны знутра жываед-драпежнік, зразумела, выпусьціць з сваіх пазуроў шмат захопленых ахвяр...

Няма чаго ўжо казаць аб тым, што перамога работнікаў у Англіі можа зусім зьмяніць увесь пануючы цяпер у сьвеце лад—да непазнаньня...

### Новы коаліцыйны ўрад у Югаславіі.

Пасьля доўгіх перагавораў—пры ўчасьці караля, дасягнута паразуменьне між сэрбскімі радыкаламі (пашычамі) і харвацкімі людоўцамі (радічаўцамі). У выніку паразуменьня ўтварыўся коаліцыйны ўрад Узуновіча (радыкал). Не ўвайшлі туды, ані сам Пашыч ані сам Радіч. Харваты, апрача 4 міністэрскіх мейсцаў, атрымалі яшчэ 4 мейсцы віцэ-міністраў.

### Разрыў міравых перагавораў з рыфэнамі.

З Марокко паведамляюць, што некаторыя варункі міру, пастаўленыя француска-гішпанскім камандаваньнем, былі рашуча адкінуты дэлегатамі Абд-Эль-Крыма. Тады старшыня француска-гішпанскай дэлегацыі заявіў, што далейшыя перагаворы—бескарысныя. На другі-ж дзень пасьля разрыву перагавораў мела распачацца ваенная акцыя. Абд-Эль-Крым абвясьціў агульную мабілізацыю ўсіх запасных.

Трэба-ж ведаць, якія варункі француска-гішпанскія імпэрыялісты паставілі імкнучымся да вольнага жыцьця пляменьням, каб ацаніць усю неабходнасьць рашучай барацьбы паўстанцаў. Вось гэтыя варункі:

1) Прызнаньне вярхоўнай улады султана (пастаўленага — купленага французамі і служачага іх інтарэсам).

2) Разбраеньне ўсіх паўстаўшых плямёнаў, (ведама-ж,—каб азброеныя да зубоў жываеды лягчэй маглі панаваць над мяйсцовым „быдлам“, захацеўшым волі!).

3) Выгнаньне павадыра паўстаньня Абд-Эль-Крыма (врдама-ж, — без галавы дык зусім лёгка парубіць на кавалкі ўсё цела!).

4) Абмен палоннымі і замірэньне.

### Не пакарылася і Сірыя.

Гучна абвешчанае францускай прэсай „пакарэньне ўсей Сірыі“ аказалася перадчасным. Узяцьце крэпасьці Суэйды яшчэ ня вырашыла лёсу паўстаньня. Друзы пад павадырствам султана Атраша ізноў гуртуюцца ў ваенную сілу, якая заяўляе, што будзе бараніць сваю зямлю ды сваю волю ад чужынцаў—да апошняга. Дэлегаты французаў, якія зьявіліся з міравымі прапазіцыямі, узяты друзамі ў палон.

### Рэвалюцыя ў рэсп. Нікарагуа.

У дробнай амэрыканскай рэспубліцы Нікарагуа выбухла „рэвалюцыя“. Лібэралы скінулі рэакцыйны ўрад ды захапілі—з помачай арміі—уладу. У краі абвешчаны ваенны стан. Прэзыдэнтам абвешчаны нейкі Сакузо.

## ХРОНІКА.

**Пахароны К. Сваяка.** 6-га траўня ў Вільні—у Літоўскай Політклініцы—памёр ад сухотаў беларускі паэт кс. К. Стэповіч, ведамы пад мянюшкай Казіміра Сваяка. Апошнія месяцы перад сьмерцяй ён лячыўся ў Закапаным, але, пачуўшы канец, папрасіў перавезьці яго на Бацькаўшчыну, каб пахавалі яго ў Роднай Зямлі.

7-га траўня ўвечары цела яго было перанесена ў касьцёл сьв. Мікалая, а 8-га пахаронена на магільніку Росса.

У пахаронах прыняло ўчасьце ўсё віленскае беларускае грамадзянства. У касьцеле прамаўляў, разьвітываючыся з нябожчыкам, пасол кс. Станкевіч; на магільніку—старшыня Беларускага Наыянальнага Камітэту грам. Савіцкі, прадстаўнікі студэнтаў (Зянюк) і вучнёўскае моладзі (Грышкевіч), прадстаўнікі беларускага духавенства і палітычных груп. Была прамова прадстаўніка літоўскага грамадзянства—палітоўску.

Трэба наагул адзначыць гарачае ўчасьце ў сумным абрадзе літвіноў. Наадварот, з польскага грамадзянства ня было нікога. Аднак, спаўняючы просьбу паэта, каб на яго магіле прамаўлялі ўва ўсіх краёвых мовах, прамовіў папольску беларус—кс. Рэшаць.

На магіле пакладзена шмат вянкоў.

**Падзяка.** Беларускае Навуковае Таварыства высказывае сваю шчырую падзяку грхм. Леону Васілеўскаму за ахвяраваны для музэю ім. Ів. Луцкевіча экзэмпляр гэктографованага журналу „Гоман“ № 2, выданага нелегальна ў 1884 годзе ў Менску. (Гэты першы орган беларускае рэвалюцыйнае інтэлігенцыі прадстаўляе вялікую рэдкасьць і дае нязвычайна цэнны матар'ял дзеля гісторыі беларускага адраджэнскага руху. Рэдакцыя нашае часопісі пастараецца бліжэй пазнаёміць з ім нашых чытачоў).

**У Віленскай Беларускай Гімназіі.** 11-га траўня пачаліся выпускныя экзамены ў гімназіі. Экзаменуюцца вучні VII і VIII клясы. У гімназіі з сёлетняга году ўведзена гэткая перамена. Вучні заканчываюць агульнаўзгадавальны курс у VII клясе, а восьмая кляса мецімe два спэцыяльныя аддзелы: пэдагагічны і матуральны (дзеля падгатоўкі да паступленьня ў вышэйшыя школы). Гэтак і тыя сямікласьнікі якія экзаменуюцца цяпер, павінны будуць выбраць той ці іншы шлях у далейшым вучэньні.

**Арышты ў літоўскай гімназіі ў Сьвянцянах.** Як паведамляе „Słowo“, 2-га траўня сярод вучняў літоўскае гімназіі ў Сьвянцянах былі зроблены вобыскі і арышты. Арыштованы былі 18 асоб, у тым вучні ад 15 гадоў. Абвінавачываюць іх у ўчасьці ў арганізацыі—пад кіраўніцтвам аднаго з вучыцялёў, якая мела на мэце ...шпіёнства на карысьць Літвы, а так-жа „замахі“ на дзяржаўныя ўстановы, узрываньне мастоў на чыгунках і вайсковых рэчаў і г. д. Доказам гэтага мае быць... 1 вінтоўка, 2 рэвальвэры і 60 патронаў, знойдзеныя пры вобысках!..

Абшарніцкне „Słowo“, падаючы гэтую вестку, тлумачыць, быццам ....літвіны самі сябе справакавалі, каб у Літве даць ураду падставы дзеля перасьледаваньня польскіх школ—у адказ на арышты пятнаццацігадовых літоўскіх „дывэрсантаў“ і „шпіёнаў“! Цынізм абшарніцкіх пісак, як бачым, ня мае граніц.

Мімаволі прыходзе на памяць крывавая драма ў **польскай** казённай гімназіі ім. Лелевэля ў Вільні, калі выявілася, што вучні-палякі ня толькі маюць рэвальвэры, але і бомбы — дзеля кіданьня ў сваіх-жа **польскіх** вучыцялёў. Ну, ды гэта былі палякі: ім усё можна! Дый у „дывэрсіі“ іх ніхто напэўна віназаціць ня будзе!..

**Выкрытая правакацыя.** „Słowo“ падае вестку аб няўдаўшайся правакацыі, зробленай б. канфэдэнтам палітычнае паліцыі ў Дзісьне, Пятром Хэнтовскім. Ён проста падкінуў у хату грам. Гіпаліта Багуцкага нейкія камуністычныя інструкцыі, а пасьля данёс паліцыі, што папаў на сьлед камуністычнае арганізацыі ў Дзісьне, ды што галавой гэнае арганізацыі зьяўляецца Багуцкі. У апошняго ўраз-жа быў зроблены вобыск і знойдзены падкіненыя дакумэнты. Багуцкага заарыштавалі. Аднак, падазроннае паступаньне Хэнтовскага і дамаганьне грошы за выдачу „камуніста“, а так-жа ўстанаўленьне пры дапросе, што Багуцкі нічога аб дакумэнтах, узятых у яго, ня ведаў, навялі на думку, што справа тут нячыстая. Пачалі дапытываць Хэнтовскага, і правакатар мусіў прызнацца, як было папраўдзе, адмовіўшыся толькі сказаць, скуль узяў камуністычную інструкцыю.

Багуцкага звольнілі, і месца яго ў вастрозе заняў Хэнтовскі. А сколькі такіх правакатараў гуляе на волі, пад той час, як іх ахвяры бязьвінна гніюць у вастрогах?

**Афіцыяльны курс грошы на 12 траўня.** Даляр — 9 зл. 05 гр. Залаты рубель — 5 зл. 14 грошы.

12. V. на чорнай біржы ў Вільні за даляр плацілі 11 зл.

## Прывітаньне Белар. Сял.-Раб. Грамадзе.

Агульны сход беларускага паступовага студэнцтва ў Празе, скліканы 10 га красавіка с. г. беларускім студэнцкім культурна-прасьветным таоарыствам „Грамада“, прыняў рэзалюцыю, у якой кажа, што „беларускае паступовае студэнцтва, знаходзячыся на эміграцыі, уважна сачыць за тэй цяжкай барацьбой, якую прыходзіцца вясьці Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамадзе за правы беларускага працоўнага народу“. Рэзка асуджаючы далей другія беларускія групы ў Сойме, якія пайшлі па шляху еднасьці з буржуазіяй і гэтым самым выпаўняюць роль слуг яе, сход сьцьвярджае, што толькі „Беларуская Сялянска-Работніцкая Грамада, стаўшы на грунт самага цеснага саюзу работніцкае клясы з сялянствам, запраўды змагаецца за сацыяльныя і нацыянальныя патрэбы беларускага працоўнага народу. Беларускае паступовае студэнцтва шчыра вітаець Беларускую Сялянска-Работніцкую Грамаду і жадаець ёй пасьпеху ў барацьбе з польскімі капіталістамі і абшарнікамі і іх беларускімі прыхвасьнямі“.

У передавіцы пад загалоўкам „Бліжэй да праўды і этыкі“—напала на нас надовячы ксяндзоўская „Беларуская Крыніца“ (№ 14)—за тое, што ў стацьці яе „Польшчына і беларусы“, зьмешчанай у № 12 „Бел. Крыніцы“, мы дагледзілі новы курс беларускіх хадэкаў—„курс на Варшаву“.

Рэдакцыя „Бел. Крыніцы“ пярэчыць нашаму вываду аб такім яе павароце, узводзячы на нас пры гэтым **беспадстаўныя** абвіненьні ў увядзеньні намі, як сыстэмы, „лаянак“, „нацягіваньня фактаў“ і г. д. Вось-жа гэтыя закіды якраз і праўдзе пярэчаць, і ад этыкі дужа далёкія, дык ня дзіва, што ксяндзоўскі орган і ня мог падаць ніякага конкрэтнага прыкладу „лаянак“ нашых і т. п. Калі „велебныя айцы“ маюць на думцы тое, што розных крыміналістаў з так-званае „полёнофільскае партыі“ (дэфэнзыўнае) беларуская левая прэса называла іх уласьцівымі імёнамі,—гэта знача: зладзея—зладзеем, шулера—шулерам, дэфэнзыўшчыка — дэфэнзыўшчыкам і г. д.,—дык гэта-ж зусім ня „лаянка“, а—сьцьвярджаньне прафэсіі! І гэта—зусім ня грэх, а хутчэй заслуга, бо перасьцерагае грамадзянства перад ягонымі шкоднікамі. Што-ж да „нацягіваньня фактаў“, дык ізноў-жа мы адносна да выступленьня „Бел. Крыніцы“ ў № 12 яе проста **падалі тое, што яна напісала, і так, як кожын чытач яе напэўна зразумеў!..**

З прыемнасьцяй адзначаючы, што рэдакцыя „Бел. Крыніцы“ так рашуча выракаецца „курсу на Варшаву“, мы пазволім сабе даць лішне гарачым нашым калегам з варожага да нас абозу, так брыдка „лаючага“ нас „камуністамі“, добрую раду: не зьмяшчаць стацьцей, асабліва на першым мейсцы, якія не адпавядаюць паглядам рэдакцыі! Гэта-ж ужо другі раз рэдакцыя „Бел. Крыніцы“ прымушана **вясьці паляміку з сваім перадавіком і пярэчыць яму:** першы раз справа йшла аб жыдоўскае пытаньне, цяпер—аб „надзеях“ на заваяваньне беларусамі сабе ўсіх правоў пад Польшчай—і то ў працягу пары гадоў! Нашы калегі з „Бел. Крыніцы“ не павінны забывацца аб тым, што аб іх паглядах можна судзіць толькі паводле таго, што яны кажуць і пішуць, а не паводле таго, што... думаюць!..

Урэшце—яшчэ адна ўвага. Калі польская ўлада перасьледуе некага з беларускіх дзеячоў з выразным абліччам, а орган тэй ці іншай групы замаўчываець навет самы факт перасьледаваньня, дык гэта ўсё роўна, як быццам яны моўчкі гаварылі ўладзе: рабеце з ім, што хочаце, — мы за гэта крыўдзіцца ня будзем!.. Вось-жа мы, прадстаўнікі сялянска-работніцкае ідэалёгіі, роўна крыўдзімся і роўна адзначаем факты гвалтаў як над „сваімі“, так і над „чужымі“, доказам чаго зьяўляецца хаця-бы тое мейсца, якое мы ўдзялілі справе ксяндза Гадлеўскага, а ён-жа якраз належа да групы „Бел. Крыніцы“! Наадварот, рэдакцыя „Бел. Крыніцы“ маўчыць, як у рот вады набраўшы, калі перасьледаваны беларускі дзеяч не належыць да яе „парахвіі“, і ня толькі „асаблівай“, але наагул **ніякай** увагі на факт перасьледаваньня не зварачае.

Вось, у гэтым мы запраўды-ж далёка адходзім ад лініі пастапаньня, ці мо' навет і ад этыкі рэдакцыі „Бел. Крыніцы“.

## Карэспандэнцыі.

### Як у нас рыхтаваліся да I мая.

(ПІНСК).

У панядзелак 26/IV па ўсім горадзе былі раскіданы камуністычныя адозвы першамайскія і іншыя. У аўторак адбыліся вобыскі на ўсіх параходах, лодках і сярод праяжджаючых сялян. Нікога аднак не арыштована.

Უначы з 29 на 30 красавіка арыштавана ў Пінску 18 асоб. Абвінавачываюць іх, як і заўсёды ўжо гэта робіцца, у прыналежнасьці да камуністычнай партыі. Пакуль што усе сядзяць. Справа перададзена пракурору.

### Злое нас баіцца.

В. Лаўрыновічы, Лыскаўскае гм. Ваўкавыскага п.).

У рэзультаце высілкаў дзейнасьці Польскай Партыі Сацыялістаў неяк нядаўна зьявіўся да нас сэкратар парабкоўскага „звёнзку" ў Ваўкавыску нейкі п. Картэльскі, які, намышкаваўшы, трохі з сім-тым пагаварыўшы (манючыся склікаць сход), штосьці паплёўся сабе да суседняга маёнтку, а там, гутарачы з парабкамі, са злосьцяй ды абурэньнем сказаў, што гэтакіх кепскіх людзей, як у Лаўрыновічах, ён яшчэ нідзе ня бачыў, бо прынялі яго вельмі ня прыхільна. Кажа, думаў пераначаваць і склікаць сход, каб з'арганізаваць камітэт, але, бачачы гэтакую няпрыхільнасьць да сябе, мусіў бяз нічога ісьці адтуль.

І добра зрабіў гэты пан, што пакінуў нас, бо гэтакіх „дружкоў" нам зусім ня трэба, а тое, што гэта праўда, дык сам „сацыяліст" добра пераканаўся. Гэтым, бязумоўна, ён збавіў нас ад сваей паскудпасьці.

Што паслужыла прычынаю таму, каб гэтак лёгка было пазбыцца п. Картэльскага,—ня ведаю: ці то нацыянальная ды сацыяльная сьведамасьць нашых сялян, ці наадварот, поўная несьведамленнасьць? Думаю, што гэтаю прычынаю была першая з вышэй зазначаных, бо дурняў, пэўна, сацыяліст Картэльскі апанаваў-бы. У кожным выпадку гэта—добрая прывва, якая павінна паслужыць прыкладам беларускім сялянам другіх вёсак.

Кожны беларус ведае, што польскі сацыялізм — гэта лякай паноў эндэкаў, які беларусам, акрамя польскасьці, нічога ня дасьць. **Эс—Эс.**

### ЛІЗУН.

(М. Гарадзея, Нясьвіскага пав.).

У нашым мястэчку на трэйцяга мая рабілі маніфэстацыю: пажарная каманда, вучні тутэйшых школ, войт, паліцыя і... сьвяшчэньнік Аляксандар Ясінскі.—Ен вышаў з крэсным ходам да маніфэстантаў і адслужыў малебен у дзень „święta narodowego". Ксёндз не пайшоў, а поп пайшоў!—Прыкрае ўражаньне: падлізваецца да паноў. Да паноў ліжацца, а з мужыка скуру дзярэ, а матушка івачай сялян не называе, як „хамамі"...

Відаць, не разумее, што сіла ў народзе, што, страціўшы веру і пашану ў народзе, ён далёка заехаць ня здолее.—І не заедзе!..

**Адзін з народу.**

### Трэйцяга мая ў Лідзкай царкве.

На трэйцяга мая ў нашай царкве была сказана казаньне ў вельмі патрыятычным духу. Хвалілі надта канстытуцыю, — што яна найлепшая ўва-ўсім сьвеце, што ў Польшчы ўсе роўныя, што ў Польшчы ня жыцьцё, а рай. Заклікалі не хадзіць пад чырвоным сьцягам, бо ходзіць з ім толькі „шантрапа", якая зьяўляецца ворагам царквы і духавенства.—Адным словам надта далёка заехаў „бацюшка" ў палітыку.

І нашто ўсё гэта?! Ясна—каб падлізацца, каб высунуцца перад уладай, каб быць на добрым „счету". Але айцы духоўныя, адна вам чэсьць і доля, толькі-б вы ня лізаліся! **Лідчанін.**

### Маленькая дэманстрацыя.

(Пастаўшчына)

Атрымліваю сяньня разам з пошты „Сялянскую Ніву" і „Беларускае Слова". Ня ўсьпеў апошнюю ўкінуць у скрынку „для спэцыяльных мэтаў", як зьяўляецца да мяне грамада сялян-суседзяў паслухаць беларускіх газэт.

На гэты раз „Беларускай Справы" не атрымаў, то, нямаючы пад рукамі лепшага чытаньня, паслухайма, што піша „Сялянская Ніва",—зьвярнуўся я да суседзяў.

— „А гэта газэта з нашых? — пытаюцца ў мяне.

— Пабачым.

Чытаю перадавіцу N B: „Спалохаліся народнага руху". Чытаю, а наперад ведаю, што гэты бруд, які ўзваліваецца на ўладу працоўных, будзе не даспадобы маей „аўдыторыі", якая складаецца чуць не з адных заможных сялян.

— „Хто гэта піша?" — пытаюцца ў мяне мае слухачы.

— Наш пасол Ярэміч, які задаўся мэтай арганізаваць сялянскі саюз, каб лепей бараніцца ад нашых „векавечных ворагаў" — рабочых і батракоў!—адказваю я цікавым.

— „Дык, калі ласка, прачытай далей",—просіць мая „аўдыторыя".

Чытаю далей і бачу, што мае слухачы па адным уцякаюць за парог, не сказаўшы мне ні слова. Я перастаў чытаць, бо некаму было слухаць, і вышаў на вуліцу, дзе сустрэў сваіх слухачоў.

— Ну, чаго-ж вы так раптам уцяклі? — пытаюся я.

— „Калі-ж неяк нудна робіцца на сэрцы, слухаючы, што тое, што нам дорага, як працоўным, абліваецца паскудзтвам. І гэта хто абліває?—тыя, каго мы чыбіралі нас бараніць, нам збудаваць лепшае жыцьцё. Ну і будуюць, толькі хто ў гэтым „будынку" будзе жыць—ня ведама! Я добра ўцяміў апошнія словы перадавіцы" — кажа адзін з слухачаў,—што гэта сказаў-бы пану Ярэмічу": народ гэтага ня сьцерпіць і прыйдзе час, што зьмяце вас са сваей дарогі. А гэты час не за гарамі, і гэта павінны быліб ведаць тыя, каму так падабаецца „фліртаваць" ужо з запраўднымі нашымі ворагамі, якіх чамусьці Ярэміч астаўляець у супакоі...

Я пакінуў грамаду, прышоў у сваю хату запісаць пад сьвежым уражаньнем гэты факт на паперку, і думаю, што нас — беларусаў не абаламуцяць! **П—ны.**

### Беларускасьць расьцьвітае — культура шырыцца.

(В. Осіповічы, Вялейскага пав.).

Прышоў травень,—кожны кусьцік расьцьвітае—усё ажыло, прачыхаецца, сьмяецца. Як-бы пачуўшы вясну, расьцьвітае і беларускасьць на вёсцы—дае красачкі беларуская культура.

4 траўня ў в. Асіповічы была згуляна п'еса Ф. Аляхновіча — „Калісь". Пасьля спэктаклю — сьпевы і скокі. Гэтая вёска мае такую марку ў паліцыі, што там, „усе бальшавікі", і ніяк не магла дастаць дазволу на спэктакль, але цяпер, дзякуючы стараньням бацюшкі Апона, удалося здабыць дазвол на вечарыну.

Хоць я меў вялікую і пільную справу тады, але рашыў застацца на вечарыне. — У восем гадзін заходжу — тэатр на вясковым таку, — душа цешыцца—скуль набралі гэтулькі крэслаў!—дарагая бразэнтавая заслона!

Публікі некалькі сотняў. Адчыняюць заслону!—Дэкорацыя задзіўляючая. Гулялі добра.

Каля мяне сядзіць селянін у шэрай сьвітцы; пытаюся: скуль ён?—Кажа: ня тутэйшы — а з в. Лазаўцы. — Радасьць агарнула мяне, што шэры селянін адчувае патрэбу тэатру, здалёк ідзець, каб пабачыць сваё роднае, каб падтрымаць яго, што—дабіваюця яго.

Пасьля спэктаклю познаёміўся я з арганізатарамі. Гэта — вясковая інтэлігенцыя. Яна ня сьпіць—працуе.

Чэсьць табе—гэтай моцнай духам інтэлігенцыі! будзь ты прыкладам для другіх!

**Глядзельнік.**

---

## З Радавае Беларусі.

### Белсельсаюз—у пасяўной кампаніі.

Да веснавой пасяўной кампаніі Белсельсаюз загатовіў для кааперараваных жыхарства на 150.000 руб. розных вырабаў з мэталаў (35 проц. агульнай патрэбы).

Насеньня Белсельсаюз загатовіў на 113.000 руб. Наагул, патрэба ў насеньні будзе здаволена амаль поўнасьцю.

Угнаеньняў с.-гасп. кааперацыя загатовіла на 282.000 р., у гэтым ліку Белсельсаюз закупіў на 100.000 руб. і акруговыя сельсаюзы—на 70.000 р.

Патрэба ў мінэральных угнаеньнях да веснавога севу здаволена на ўсе 100 проц.

Сельска-гаспадарчага інвэнтара Белсельбанк загатовіў на 917,000 р.

### С.-г. крэдыт.

У другім квартале с. г. на сельскую гаспадарку Белсельбанк адпусціў, як крэдыт, 1.228.500 р. Гэтыя сродкі пойдуць выключна на вытворчыя патрэбы, адпаведна чаму большая палова іх (751.500 р.) мае доўгатэрміновы характар.

Крэдыт мае гэткае прызначэньне: на куплю рабочае скаціны—125.000 р., с.-г. машын і прыладаў —110.000 р., на с.-г. будынкі—170.000 р., на земляўпарадкаваньне і перасяленьне—180.000 р., на мінэральныя і зялёные ўгнаеньне — 60.000 р., на травасеяньне і вырашчываньне насеньня—295.000 р., на набыцьцё рагатай жывёлы—50.000 руб., на малочную справу, закладку пітомнікаў, пчалярства і інш.—138.500 руб.

### Рост с.-г. кааперацыі.

У сучасны мамент па БСРР налічваецца каля 1.000 с.-г. кааперацыйных аб'яднаньняў са 150.000 сябрамі.

На 1 студзеня 1925 г. гэтых аб'яднаньняў было 867 з 48.000 сябрамі.

Паявы капітал узрос з 162.000 руб. (на 1 студзеня 1925 г.) да 350.000 (да пачатку 1926 г.).

У паказаны лік уваходзяць толькі кааперацыйныя аб'яднаньні—пайшчыкі Белсельсаюзу.

### Пашырэньне дзейнасьці дзярж. кас ашчаднасьці.

За сакавік уклады дзяржаўных працоўных кас ашчаднасьці павялічыліся на 25.919 руб. і на 1-га красавіка выявіліся ў агульнай суме 880.099 руб., прычым па асобных касах гэта сума разьмяркоўвалася так: пашт.-тэлегр. касы—407.249 р., пасрэдніцкія касы—25.470 руб., касы пры філіялах дзярж. банку — 16.519 руб. і чыгуначныя касы — 4.687 руб.

Кліентура кас павялічылася на 714 чал. і на 1-га красавіка дасягнула 19.927 укладчыкаў.

За апошні час значна павялічылася кліентура па апэрацыях куплі, прадажы і закладу абліга дзярж. пазык.

Для выгады кліентуры галоўная каса пашырыла вядзеньне апэрацый да 9 з палов гадзіны вечара і па нядзелях—ад 10-й да 3-й гадз. дня.

### Дэлегат БСРР у Парыжу.

На міжнародавую санітарную канфэрэнцыю, якая мелася адчыніцца ў Парыжу 10 мая, урад БСРР выдэлегаваў свайго прадстаўніка—нар. камісара аховы здароўя Барсукова.

Канфэрэнцыя мае на мэце апрацоўку і зацьверджаньне правіл супольнай барацьбы з рознымі пошасьцямі ў пагранічных раёнах, што якраз дужа важна для Радавае Беларусі, якая мае даўгую граніцную лінію з Польшчай.

### Беларусізацыя вайсковых часьцей.

Камандны склад вайсковых часьцей, якія знаходзяцца ў Менску, праходзіць курс па вывучэньню беларускае мовы. Уся палітпраца праводзіцца пабеларуску.

У найбліжэйшым часе маюць быць учынены належныя крокі дзеля перавядзеньня і дапрызыўнай падрыхтоўкі на беларускую мову.

### Другі Усебеларускі Настаўніцкі Зьезд.

На 11 мая назначана ў Менску адчыненьне II-га Усебеларускага Настаўніцкага Зьезду. Зьезд гэты асабліва важны з таго боку, што павінен выявіць ідэйнае аблічча беларускага настаўніцтва, сярод якога яшчэ так нядаўна крэпка сядзеў стары дух—истинно-русски" і „царасланы". Зьмена палітычных і сацыяльных настрояў сярод настаўніцтва і беларускае нацыянальнае ўсьведамленьне за апошнія гады зрабілі тут вялікі крок уперад.

### У Менскім Беларускім Пэдагагічным Тэхнікуме.

Другі сэмэстр сёлетняга навучальнага году адзначыўся пераходам на лябараторны мэтад выкладаньня.

Трэба сказаць, што першыя спробы далі ня зусім добрыя вынікі. Перапшае, ня ўсе настаўнікі правялі канфэрэнцыі, а гэтаксама і ўступныя гутаркі, без якіх па некаторых дысцыплінах немагчыма прыступаць да выконваньня заданьня. Падругое, недахват падручнікаў (на 3-4 асобы адзін падручнік), пры абавязковым прысутнічаньні на занятках прыводзіць да таго, што студэнты, не пасьпяваючы распрацаваць тое ці іншае заданьне на занятках, сядзяць цэлыя вечары дома ці ў бібліятэцы і ўтвараецца навет канкурэнцыя.

Асабліва характэрным і цікавым зьяўляецца чацьвёрты тыдзень, калі падыходзіць здача заданьняў.

Праца тады кіпіць ваўсю. Дзе там думаць аб якім гуртку, калі баявое заданьне—вучоба!

Бязумоўна, што пры такім становішчы—пры недахвацы падручнікаў прыходзіцца працаваць 10-12 гадзін у дзень замест паложаных 6 гадз., бо ні ў якім разе распрацаваць 40-55 старонак за 6 гадз., напрыклад, такой дысцыпліны, як хімія, немагчыма.

---

## Паштовая скрынка.

Грамадз. **Швіфу.** — Вы прыслалі карэспандэнцыю без свайго прозьвішча і адрасу, — дык ня зьмесьцім.—Трэба падаваць прозьвішча і адрас толькі для ведама рэдакцыі. Ня сказана ў вас такжа, хто і за што забіў войта. Ахвотна будзем другія Вашыя лісты аб жыцьці—Піншчыны друкаваць, падавайце толькі факты. Зазначайце адкуль карэспандэнцыя.

Грам. **Вайтовічу.** Цыркуляр „эміграцкага" бюро атрымалі. Пісьмо Вашае дзеля ўладжаньня закранутай Вамі справы аддалі ў „Грамаду".

**Атрымана:**

Ад: — Базыля Крука, А. Кавалеўскага, Мікалая Ламекі, Яна Усьціновіча, І. Піваварчыка, Паўла Сьвірыда, Мікалая Шакуля, М. Грыгаровіча, Тамаша Кандрацюка, Мікалая Лук'янца, Аляксандра Пахвіцэвіча, П. Дрэмчука, Я. Мінайлы, Паўла Барыса, Васіля Рэцькі, Аляксандра Вільчыцкага, Пятра Волка, Данілы Дожына, А. Данілюка, Юркі Маркевіча, Гальшка Леўковіча—**па 5 злотых.**

Ад:—Аляксея Бруквра, А. Яроміча, Яна Боўсюка, Ігната Шошкі, Рыгора Камара, Язэпа Загорскага, Яна Сініцкага, Язэпа Ермаловіча, С. Забаўскага, Сьцяпана Арабока, Лаўрэна Казака, Ігната Рамука — **па 6 зл.**

Ад:—Пятра Канона, Яна Махамэта, Кузьмы Лешчынскага, Марыяна Зёнтка, Антона Гардзея — **па 8 злотых.**

Ад:—Кл. Казака, Нестара Пераволя, Яна Шэйбака, Міхала Калюты, Нікіпара Савіча, Канстантага Койлы, Аляксандра Протаса, Паўла Кучынскага — **па 10 злотых.**

Ад:—П. Крынчыка—16 зл., Базыля Маладзяна—20 зл., Уладзіміра Булаўкі — 7 зл., Трахіма Сакаловіча—12 зл., Ціхана Бухавецы—2 зл. 60 гр., Яна Далядукі—1 зл. 50 гр., Язэпа Клапіна—10 зл. 95 грош., Міхала Жынокі—2 зл. 13 гр., Міхала Утліка — 3 зл. 50 гр., А. Трэпкі—7 зл., Уладыслава Шляхцюка — 2 зл. 50 гр., К. Мушынскага—7 зл. 65 гр., Язэпа Рагача—7 зл. 50 гр., Антона Давідовіча — 2 зл. 20 грош., Мар'яна Зёнтка—14 зл., Якіма Носа — 6 зл. 50 гр., Яна Качаргіна—2 зл. 30 гр., М. Шохар—20 зл., Аляксандра Кулакоўска — 8 зл. 40 гр., Дарафея Марчука 4 зл. 30 гр. За прададзеныя газэты ў Дунілавічах — 9 зл. 45 гр.

Рэдактар-Выдавец: Ал. Вільчыцкі. Друкарня Н. Левін і Сын, Вільня, Нямецкая 22.